ISSN 0234—1360

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА Ў ШКОЛЕ

12'89

Валеры БОЛБАС

# ЗАСНАВАЛЬНІК ТЭОРЫІ СЯМЕЙНАГА ВЫХАВАННЯ

Сімяон Полацкі (1629—1680) нарадзіўся ў г. Полацку. Атрымаўшы выдатную для свайго часу адукацыю, будучы чалавекам вельмі таленавітым, пастрыгся ў манахі дзеля таго, каб аддаць усё сваё жыццё асветніцкай і навуковай дзейнасці. Хутка на гэтай ніве дасягнуў такіх поспехаў, што быў запрошаны з Беларусі да царскага двара ў Маскву, дзе быў настаўнікам і выхавальнікам царскіх дзяцей. Адначасова вучыў грамаце пад'ячых з Прыказу тайных спраў. Займаўся featuresнабаковай грамадскай, рэлігійнай, навуковай, літаратурнай і выдавецкай дзейнасцю. Адзін з аўтараў праекта славутай «Славяна-грэка-лацінскай акадэміі», ён лічыў, што ўсіх бед на зямлі можна пазбавіцца шляхам адукацыі і выхавання людзей.

Вялікі беларуска-рускі мысліцель увасабляе ў сабе даўнія аднакарэнныя сувязі беларускага і рускага народаў. Уклад Сімяона Полацкага ў развіццё культуры Расіі ў такой ступені разнастайны і вялікі, што яшчэ буржуазныя гісторыкі называлі яго адной з самых характэрных асоб свайго часу. У многіх кірунках сваёй шматграннай дзейнасці ён быў у ліку заснавальнікаў і першапраходцаў. Аб яго жыцці, дзейнасці і поглядах напісаны дзесяткі навуковых прац, выдадзена многа кніг. Прапаноўваемы матэрыял раскрывае адзін з менш даследаваных бакоў педагагічнай спадчыны С. Полацкага — фарміраванне маральных асноў тэорыі сямейнага выхавання.

Выдатнае выслоўе старажытнагрэчаскага філосафа Геракліта «Усё цячэ, усё мяняецца» можна прымяніць да ўсіх бакоў жыцця. Не з'яўляецца выключэннем і справа выхавання падрастаючых пакаленняў. З развіццём грамадства мяняўся змест выхавання, прынцыпы і метады яго ажыццяўлення. Лепшым экзаменатарам жыццёвасці розных поглядаў і падыходаў у гэтай галіне чалавечай дзейнасці з'яўляецца час, на працягу якога адны з канцэпцый і адпаведных ім сродкаў адміралі, не апраўдаўшы ўскладзеных на іх надзей, другія цярпелі пэўныя змены ў залежнасці ад узроўню і кірунку грамадскага развіцця, а трэція... Трэція ўяўляюць сабою тую частку духоўных каштоўнасцей, над якімі не ўладарны час. Іх жыццёвасць, праўдзівасць і непераходзячае значэнне пацвярджаліся грамадскай практыкай многіх краін і народаў у розныя эпохі.

З такіх пазіцый асаблівую цікавасць уяўляе вывучэнне вопыту папярэдніх і далёкіх пакаленняў, што дапамагае нам выверыць стан цяперашніх спраў, глыбей разабрацца ў правамернасці тых або іншых змен у падыходзе да рашэння адной з галоўных задач сённяшняга дня — выхаванне актыўнай, творчай асобы.

У фарміраванні асобы ва ўсе часы надавалі вялікае значэнне выхаванню ў сям'і. Таму хацелася б пазнаёміць чытачоў з педагагічнымі поглядамі на гэтую праблему аднаго з самых славутых асветнікаў Расіі і Беларусі другой паловы XVII ст. Сімяона Полацкага, які стаяў ля вытоку фарміравання тэорыі сямейнага выхавання. Беларус па нацыянальнасці, выхаванец Кіева-Магілянскай калегіі, большую частку свайго жыцця пражыў у Маскве. Ён у сваёй тэарэтычнай і практычнай дзейнасці сінтэзаваў і значна развіў лепшыя дасягненні педагогікі трох братніх народаў. Можна толькі пашкадаваць, што яго дзейнасць не разглядаецца ў «Антологии педагогической мысли Белорусской ССР» (М., 1986). Напэўна, толькі мы, беларусы, не захоўваем доўгую памяць пра сваіх слаўных продкаў. Буйнейшы грамадскі дзеяч свайго часу, ён з'яўляецца першым прыдворным паэтам, першым айчынным прафесійным драматургам, з яго імем звязваюць станаўленне і развіццё рускага тэатра (3. С. 199).

Большую частку свайго жыцця С. Полацкі прысвяціў настаўніцкай дзейнасці — спачатку на Беларусі, у брацкім вучылішчы полацкага Богаяўленскага манастыра, а затым у Маскве, у школе Заіканаспаскага ма-

настыра. Калі быў хатнім настаўнікам царскіх дзяцей, спецыяльна для малалетняга Пятра I стварыў буквар, па якім выхаванне царэвіча ажыццяўлялася пад уплывам ідэй вучонага. Справа ў тым, што тагачасны буквар быў не проста падручнікам для навучання чытанню, а змяшчаў у сабе мноства навучальнага матэрыялу. Гэта значыць быў сродкам для выхавання грамадзянскіх пачуццяў і маральных правілаў. Ды і сам працэс выхавання будучага вялікага рэфарматара кантраляваўся і накіроўваўся праз Мікіту Зотава Сімяонам. Полацкі пакінуў пасля сябе мноства літаратурных і навуковых твораў, якія з'яўляюцца не толькі унікальнымі пісьмовымі помнікамі культуры, але і выклікаюць цікавасць з пазнавальнага пункту гледжання. Многія погляды мысліцеля з'яўляюцца актуальнымі і ў нашыя дні.

Сёння асаблівую цікавасць уяўляе той перыяд у жыцці нашай дзяржавы, які быў рубяжом пераходу Расіі ад старой сярэдневяковай Русі да Расійскай імперыі. Гэта быў перыяд, калі Расія нібы рыхтавалася да гіганцкага рыўка пятроўскіх часоў. «Руская дзяржава была пастаўлена перад неабходнасцю прызнаць народную адукацыю адной з самых надзённых сваіх задач, прыблізіць яе да ўзроўню заходнееўрапейскай»,— сцвярджаюць даследчыкі Дз. Жукаў і Л. Пушкароў (3. С. 216). Думка, як бачым, сугучна з днём сённяшнім.

Адным з самых дэталёва распрацаваных пытанняў педагогікі ў Сімяона Полацкага з'яўляецца пытанне сямейнага выхавання. У распрацоўцы гэтай праблемы ў Расіі яго смела можна назваць адным з першапраходцаў. Да С. Полацкага былі толькі асобныя настаўленні адносна сямейнага побыту, як, напрыклад, вядомы «Домострой», але выхаванню ўдзялялася вельмі мала ўвагі. Тэарэтычныя ідэі вучонага мелі пад сабой трывалую практычную базу. Справа ў тым, што навучанне ў школе Заіканаспаскага манастыра мала чым адрознівалася ад хатняга. Усе чатыры вучні школы жылі ў ёй, а адзін з іх, вядомы пазней паэт і мысліцель Сільвестар Мядзведзеў, кватараваў у адной келлі са сваім настаўнікам. У сваіх вершах — «Учение», «Учай, а не творяй», «Честь», «Нрав» і многія іншыя, а таксама ў педагагічных працах Сімяон Полацкі фармулюе мэты сямейнага выхавання, распрацоўвае яго змест, прапаноўвае шляхі дасягнення пастаўленых задач. Канчатковую мэту выхавання ён бачыць у фарміраванні «совершенного человека на всякое дело уготованного» (8. С. 174). Хоць С. Полацкі з'яўляўся царкоўным дзеячам, ён тым не менш рашуча адвяргаў галоўную ролю ў дзіцяці прыроджаных якасцей. Ужо ў той час ён крытыкаваў астралагічныя погляды аб наканаванні лёсу чалавека ў залежнасці ад зоркі, пад якой нарадзіўся. На яго думку, усё залежыць ад выхавання, якое дзіця атрымала. У прадмове да свайго «Буквара» асветнік заклікае пачынаць выхаванне як мага раней «от материнской груди» (1. С. 332).

У вершы «Нрав», ён піша, што як цяжэй перасадзіць старое дрэва ў параўнанні з маладым, так цяжэй выхаваць старэйшага. Адзначае, што маральныя якасці, выхаваныя ў дзяцінстве, захоўваюцца на ўсё жыццё: «нрав юноши, с детства всаженный, даже до старости бывает храненный» (10. С. 380). Верачы ў сілу выхаваўчага ўздзеяння на чалавека, С. Полацкі заўважае, што так, як садоўнік павінны ў крывізне дрэва, як у агіднасці карціны вінаваты мастак, так і выхавальнік нясе адказнасць за «злонравие» дзяцей.

Полацкі лічыў, што менавіта сям'я з яе укладам і традыцыямі з'яўляецца асноўным фарміруючым звяном душы дзіцяці. Ён заклікае бацькоў, падобна таму, як ва ўсім жывёльным свеце дарослыя клапоцяцца аб малых, пастаянна клапаціцца аб выхаванні сваіх дзяцей. Мысліцель сцвярджае, што сапраўднымі бацькамі з'яўляюцца не нарадзіўшыя цела, а тыя, якія маральна сфарміравалі душу дзіцяці. І калі бацькі хочуць, каб іх дзеці атрымалі добрае выхаванне, то яны не павінны шкадаваць на гэта ўласных намаганняў. Ён папярэджвае, што хоць той ці іншы чалавек нарадзіўся «от благих родителей, но при их недосмотре может впоследствии обратиться к злым делам» (3. С. 220) і наадварот, той, хто нарадзіўся ў «худом» доме, праз выхаванне можа здабыць у далейшым сапраўдны гонар і славу.

Цікавай з'яўляецца спроба С. Полацкага вызначыць асноўны змест выхавання і адукацыі па ўзростах. Ён спрабуе падзяліць працэс выхавання дзяцей на тры сямігадовыя перыяды. У першыя сем год рэкамендуе прывіваць дзіцяці такія якасці, як праўдзівасць, стараннасць і выхаванасць. У другую «седмицу» падлетка патрэбна навучыць якому-небудзь рамяству, у апошні перыяд з 14 да 21 года юнак павінен успрыняць добры розум, страх божы і прамудрасць.

Галоўнае месца ў фарміраванні асобы Сімяон Полацкі адводзіць маральнаму выхаванню — «добронравию, яко

без оного аки тело без души есть» (3. С. 223). Педагог папярэджвае, што набытае багацце маральных якасцей значна каштоўней за любыя матэрыяльныя скарбы. Прычым вышэйшай формай маральнасці, па яго перакананні, з'яўляецца любоў да ўсіх праяў быцця. Выкрываючы асноўныя людскія заганы — сквапнасць, крывадушнасць, ляноту, жорсткасць, зайздрасць, несправядлівасць, падхалімства, эгаізм, вечнае душэўнае рабства,— ён заклікае культываваць такія якасці, як праўдзівасць, міласэрнасць, чалавекалюбства, сціпласць, любоў да Радзімы, пачуццё ўласнай годнасці, павагу да людзей працы.

Асновай маральнага выхавання ён лічыў маральную асвету, г. зн., каб дабіцца ад дзіцяці здзяйснення прыстойных учынкаў, трэба спачатку этычныя нормы паводзін сфарміраваць у яго думках — «то что сокровенно зо мысли пребудет, то по мале во делах проявлено будет» (4. С. 259).

Як паслядоўны асветнік С. Полацкі пераважнае значэнне надае разумоваму выхаванню. Праслаўляючы веды і працэс іх набыцця, ён бачыць крыніцу амаль усіх бед у неадукаванасці і невуцтве. Прыхільнік асветнага абсалютызму, усюды і ва ўсім ён звяртаецца да чалавечага розуму, імкнецца выклікаць любоў да кнігі, жаданне вучыцца. Называючы кнігу крыніцай мудрасці, ён заключае: «Само чтение многих умудряет» (6. С. 247). Сотні вершаваных радкоў С. Полацкі прысвячае перавагам адукаванага чалавека, падкрэслівае, што такія людзі становяцца ўпэўненымі ў сваіх сілах, маюць значна больш магчымасцей прынесці карысць сабе і іншым. Бацькі павінны метадычна выхоўваць у дзецях настойлівасць і ўпартасць у авалоданні ведамі, бо «не сила капли камень пробивает, но яко часто на того падает...» (6. С. 74).

Верачы ў неабмежаваныя магчымасці пазнання, ён перасцерагае ад павярхоўнага падыходу да вывучэння тых або іншых рэчаў. Параўноўваючы веды, атрыманыя пры павярхоўным вывучэнні, з ягнём, а пры ўнутраным, глыбокім — са сланом, ён заклікае вучняў пранікаць у глыбіню з'яў і «познать слона» (4. С. 225). У тэорыі і на практыцы прапагандыст і папулярызатар свецкіх ведаў С. Полацкі імкнуўся выхоўваць у дзяцей пачуццё цікаўнасці, дапытлівасці, крытычнага асэнсавання з'яў, што было смелым і прагрэсіўным узлётам думкі ў час панавання рэлігійнай схаластыкі. Ні на ёту не страціла важнасці гэтае палажэнне і ў нашы дні.

Бясспрэчная заслуга С. Полацкага ў тым, што працу ён разглядае не толькі як сродак існавання, а разумее яе велізарнае выхаваўчае значэнне, лічыць яе адной з важнейшых крыніц маральнага выхавання асобы. Педагог лічыць прамым абавязкам бацькоў прывучаць з малых гадоў дзяцей да працы: «Да обучают дети своя или рукоделию некоему или иному честному коему упражнению» (8. С. 175). У бяздзейнасці ён бачыць крыніцу многіх заган і бед. Нават цар павінен умець рабіць любую работу і быць прыкладам у працавітасці для падначаленых. Ці не тут вытокі адносін Пятра I да чорнай работы? Любоў дзіцяці да працы — гэта якасць, якую цяжка пераацаніць, якая ў далейшым будзе мець рашаючую ролю у матэрыяльным і духоўным жыцці чалавека, вось чаму мысліцель нястомна заклікае «всех поощряти на трудолюбие» (10. С. 357—366).

У педагагічных сачыненнях і літаратурных працах Сімяона Полацкага не толькі выразна гучаць ноткі асаблівай павагі да працалюбівых людзей, але ўжо чуецца яго незадаволенасць эксплуатацыяй чужой працы, яго абурае сквапнасць багатых, якія «здзіраюць» з беднякоў скуру (6. С. 13). Задача бацькоў — выхоўваць у дзяцей думку, што «человек... своих не чуждых трудов плодом жити должен» (4. С. 242).

Філосаф-педагог даволі дакладна падмеціў выхаваўчую ролю мастацтва, якое, апрача пазнавальных функцый, здольна фарміраваць у чалавека добрыя норавы. У цэлым выхаванне тады прынясе плён, калі бацькі будуць не толькі даваць дзецям веды маральных норм, выпрацоўваць маральныя паводзіны, але і фарміраваць маральныя пачуцці. На думку мысліцеля, роля эстэтыкі ў гэтым такая, што знешняя, пачуццёва ўспрымаемая чалавекам прыгажосць, якую нясе мастацтва, здольна выклікаць унутраную духоўна-маральную прыгажосць, абудзіць лепшыя пачуцці людзей. Ён перакананы, што чым вышэй культура таго ці іншага чалавека, тым вышэй яго маральнасць. Сімяон Полацкі лічыць, што прыгожае не можа быць звязана з няпраўдай, з паганым норавам. Таму настойліва рэкамендуе далучаць дзяцей да прыгожага, якое ў яго часта атаясамліваецца з маці, Радзімай, чалавечай дабрачыннасцю. Бацькі, на яго думку, абавязкова павінны арганізаваць пазнанне дзецьмі музыкі, жывапісу, паэзіі. Ён падкрэсліваў, што вельмі важна навучыць дзяцей уменню бачыць прыгожае, бо іншы раз пад

знешняй выродлівасцю хаваецца маральная прыгажосць, а бывае наадварот, што выродлівае і агіднае можа з'явіцца пад маскай прыгажосці. Ён абураецца, што ў жыцці часта «доброта не зрится, красная риза паче человека чтится» (7. С. 42). У сваёй педагагічнай практыцы Полацкі ў якасці дзейсных сродкаў эстэтычнага і маральнага выхавання выкарыстоўваў удзел вучняў у школьных тэатрах і пеўчых хорах.

Ужо ў той час С. Полацкі закранаў пытанні антыалкагольнага і палавога выхавання. Ён ярасна бічаваў п'янства, папярэджваў, што віно валодае такой шкоднай сілай, якая можа збіць людзей з правільнага шляху (10. С. 369—370). Выкрываючы факты палавой разбэшчанасці, ён дае бацькам нават такую практычную параду, што нельга класці дзяцей спаць у адну пасцель.

У сваіх літаратурна-педагагічных сачыненнях Сімяон Полацкі даволі падрабязна асвятляе прынцыпы і метады выхавання ў сям'і — «тое, што да яго ніхто у Расіі яшчэ не зрабіў» (8. С. 174). У цэлым прыхільнік характэрных для таго часу жорсткіх метадаў выхавання, ён у той жа час вучыць, што ў аснове сямейнага выхавання павінна быць сапраўдная любоў да дзяцей. Выхаванцаў трэба засцерагаць ад грубасці і брыдкаслоўя. У сваёй практычнай і тэарэтычнай дзейнасці педагог надае велізарнае значэнне метаду пераканання. У павучальных вершах і пропаведзях ён з максімальнай прастатой і даходлівасцю выкладае свае погляды. На яго думку, кожны выхавальнік у гэтай справе павінен быць умелым.

У здаровым высокамаральным сямейным укладзе ён бачыць залог поспеху ў фарміраванні і станаўленні асобы дзіцяці. Вялікі педагог павучае, што плод падае блізка ад дрэва, што арол нараджае арляня, падобнае на яго. Аднак у той жа час ён адзначае, што ў многіх добрых бацькоў могуць быць кепскія дзеці, калі ў сям'і не займаюцца іх выхаваннем. Не менш важную прычыну такой з'явы педагог бачыць у празмернай любві да дзяцей, якая перарастае ў патаканне іх капрызам і непамернаму свавольству. Прыводзіць прыклад з антычнай міфалогіі аб сыне Сонца Фаэтоне, які, карыстаючыся празмернай да яго любоўю бацькі, выпрасіў дазволу пакатацца ў бацькоўскай вогненнай калясніцы. Не маючы ні сіл, ні вопыту, ён ледзь не спаліў неба і зямлю, дзеля выратавання якіх бацька Сонца вымушаны быў маланкай забіць сына. Полацкі папярэджвае, наколькі небяспечна дапускаць дзяцей «на коней самовольства и колесницу богатства» (1. С. 342). Ён падкрэслівае, што не ўсялякія дзіцячыя дзівоцтвы трэба выконваць, ва ўсім павінна быць пачуццё меры.

Адзін з галоўных метадаў выхавання ў сям'і, лічыць педагог-мысліцель,— асабісты прыклад бацькоў. У вершы «Увещание к читателю» ён піша: «...от детства благим деле сем учите и сами благо перед ними творите...» (4. С. 264—265). С. Полацкі справядліва заўважае, што калі мы заклікаем рабіць дабро, а самі гэтага не робім, то карысці ад такога выхавання будзе мала.

Заклік прывучаць дзяцей пастаянна рабіць добрыя справы пранізвае ўсе педагагічныя творы Полацкага. Яго выслоўе «Тщися ты убо все добро творити» (4. С. 250) нібы прадугадвае крылаты сёння выраз «Спяшайцеся рабіць дабро».*

Чалавек, у разуменні С. Полацкага, павінен жыць на карысць іншым. Важна адзначыць, што вялікі мысліцель, не адмаўляючы метадаў прымушэння, заклікаў выхавальнікаў: «преклоняти сердце подобает ко творению делес» (10. С. 369), г. зн. выхоўваць у іх унутраную патрэбнасць у добрых учынках.

Актуальнай і сёння з'яўляецца думка вялікага мысліцеля аб тым, што калі пачынаеш штосьці рабіць, у тым ліку і ў пытаннях выхавання, то трэба загадзя мець мэту, да якой хочаш прыйсці: «Егда хочешь дело начинати, конец первое требе разсуждати» (4. С. 260). Тым самым вучоны закладвае асновы прынцыпу мэтанакіраванасці ў справе выхавання.

Асобай увагі заслугоўваюць падыходы С. Полацкага да самавыхавання. Бацькі на дзіця павінны глядзець не толькі як на аб'ект, але і як на суб'ект выхавання. Адным з буйнейшых дасягненняў выхавання ў сям'і ён лічыць фарміраванне патрэбнасці самааналізу, самаацэнкі, каб дзіця магло заняцца выпраўленнем сваіх недахопаў. У адным з сваіх вершаў С. Полацкі піша: «Благо есть человеку самого ся знати, и всегда рассуждати, какие в нем немощи...» (4. С. 265). Больш таго, ён робіць крытычны вывад, што калі чалавек не ведае сябе, то ён нічога не ведае.

---

* Гэтыя словы належаць старэйшаму ўрачу маскоўскіх бальніц Ф. П. Гаазу (1780—1853). Заклік высечаны на пастаменце помніка Ф. П. Гаазу ў Маскве (гл.: Н. С. Ашукин, М. Г. Ашукина. Крылатые слова.— М., 1987. С. 480).

Важны вывад робіць Полацкі аб тым, што гонар, слава бацькоў не павінны аўтаматычна пераходзіць на дзіця, што выхаванне ў сям'і павінна быць пастаўлена такім чынам, каб дзіця адчула неабходнасць самому, сваімі сіламі дабівацца павагі і гонару.

Разумеючы, што на фарміраванне асобы дзіцяці, апрача сям'і, актыўнае выхаваўчае ўздзеянне аказвае і навакольнае асяроддзе, С. Полацкі рэкамендуе бацькам засцерагаць дзяцей ад дрэнных сяброў і арыентаваць іх «на общение с добрими», бо «ходящий с премудрым будет премудр». Ен папярэджвае, што трэба дзіця навучаць распазнаваць сапраўдных сяброў, бо той, хто «грех твой обличает, не враг ти но друг. Блага ти желает», а таксама «познавай други в год нужды твоея» (4. С. 249).

Маючы на ўвазе тое, што чалавек — істота «содружная», С. Полацкі вялікае значэнне прыдае выхаванню пачуццяў дружбы, таварыскасці. Ён бачыць у гэтым і сродак, і адну з мэт выхавання і адзначае, што калі б замест «тваё» і «маё» мы часцей гаварылі «наша», вельмі многае ў гэтым свеце змянілася б да лепшага (7. С. 30). Нават калі чалавек сваімі ведамі, мудрасцю не дзеліцца з навакольнымі, а ўтойвае ў сабе, то ён прыпадабняецца да бязглузднага, які закопвае ў зямлю «чыстае золата». Атрыманыя веды павінны знаходзіць прымяненне ў жыцці.

Зразумела, было б наіўна думаць, што пры ўсім знешнім падабенстве гэтых маральных якасцей з нормамі камуністычнай маралі такім жа будзе і іх змест. У сілу гістарычных прычын у С. Полацкага яны ўпляталіся ў хрысціянскі светапогляд і насілі ярка выражаны евангелічны характар.

Першапраходцам з'явіўся С. Полацкі і ў вызначэнні ролі маці ў выхаванні дзяцей. Да яго гэтае пытанне ў рускай педагогіцы замоўчвалася (8. С. 175). У патрыярхальным укладзе сям'і жанчыне адводзілася роля прыслугі, паўрабыні. У стратэгічных пытаннях выхавання дзяцей яна была другараднай, толькі дапамагала галаве сям'і ажыццяўляць яго стыль і метады, хаця фактычна на ёй ляжала цяжкая ноша паўсядзённага выхавання дзяцей. Вялікі мысліцель адным з першых у гісторыі айчыннай педагогікі ўказаў на неабходнасць дзейснага ўдзелу ў гэтым працэсе жанчыны-маці.

Да Полацкага ўсе педагогі пераважна распрацоўвалі пытанні выхавання юнакоў, у яго ж поглядах прасочваецца думка аб выхаванні дзяўчат. Так, у «Слове у день святая Софья и чад ея» ён славіць вобраз ідэальнай маці, якая выхоўвае сваіх дачок «добронравием, честностью и страхом божьим» (8. С. 175).

Сімяон Полацкі жыў і тварыў у складаны пераломны перыяд гісторыі нашай Радзімы. Гэта быў час абсалютнага панавання рэлігійнага светапогляду, яго педагагічныя ідэі нясуць на сабе глыбокі адбітак хрысціянскага веравучэння, але, як нам здаецца, многія рэалістычныя, свецкія ідэі і погляды толькі пакрывалі царкоўнай абалонкай, каб яны маглі атрымаць «пуцёўку ў жыццё». Педагог-мысліцель, выражаючы ў цэлым інтарэсы пануючых класаў, у сілу гістарычных умоў у многім стаяў на пазіцыях аўтарытарнасці і прывілеяванасці ў выхаванні, быў прыхільнікам цялесных пакаранняў. Аднак для нас значна важней не тое, як далёка знаходзяцца яго тэарэтычныя абгрунтаванні ад цяперашніх, а тое, як папярэднія зрушаны ўперад і што карыснае для сябе мы можам зараз з іх узяць. Па заключэнні К. Тарасава, «Полацкі абагнаў расійскую рэчаіснасць на цэлае стагоддзе» (9. С. 108).

У «Асноўных напрамках рэформы агульнаадукацыйнай і прафесійнай школы» сказана: «Усё каштоўнае, здабытае працай некалькіх пакаленняў педагогаў, савецкай школай і педагагічнай навукай, што вытрымала праверку часам, павінна быць беражна захавана і актыўна выкарыстана» (5. С. 75).

Літаратура

1. Антология педагогической мысли Древней Руси и Русского государства XIV—XVII вв.— М., 1985.
2. Древнерусская литература. Хрестоматия / Сост. Н. Прокофьев.— М., 1988.
3. Жуков Дм., Пушкарев Л. Русские писатели XVII века.— М., 1972.
4. Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии (XVI—XIX вв.) — Мн., 1962.
5. Материалы первой сессии Верховного Совета СССР одиннадцатого созыва.— М., 1984.
6. Полоцкий Симеон. Избранные сочинения.— М.-Л., 1953.
7. Пузиков В. М. Общественно-политические взгляды Симеона Полоцкого.— В сб. БГУ: Научные труды по философии.— Мн., 1958. Вып. II. Ч. II.
8. Пушкарев Л. Н. Общественно-политическая мысль России. Вторая половина XVII в.— Мн., 1982.
9. Тарасов К. Память о легендах: Белорусской старины голоса и лица.— Мн., 1987.
10. Хрестоматия по истории педагогики / Сост. И. Лакин, М. Макаревич, А. Рыгачов.— М., 1971.